

# Гродзенскі ўніверсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● № 9 (280) ● *18 верасня 2000 года, пятніца*

Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


# ДЗЕНЬ ВЕДАЎ



**Матэрыялы аб святкаванні Дня ведаў чытайце на 2-3 стар.**

## ПРАХАДНЫ БАЛ І КОНКУРС

На дзённую бюджэтную форму навучання высокі прахадны бал быў на спецыяльнасці «Англійская мова», «Французская мова», «Нямецкая мова» — 13 з 15. «Сучасныя замежная мовы» — 13,5 з 15. На спецыяльнасць «Біялогія» — 12 балаў з 15. Такі ж конкурс на спецыяльнасці «Дэфекталогія», «Руская мова і літаратура», «Правазнаўства».

Лягчэй было паступіць на спецыяльнасці «Прыборабудаванне», «Радыёфізіка». Прахадны бал тут складаў 9 з 15.

Самы вялікі конкурс — па 4,53 чалавекі на месца — быў на спецыяльнасць «Сучасныя замежныя мовы». У мінулым годзе ён складаў 2,4 чалавекі. Далей ідуць спецыяльнасці «Выяўленчае мастацтва і чарчэнне» — 3,8, «Дэфекталогія» — 3,67, «Правазнаўства» — 3,65 чалавекі на месца, «Англійская мова» — 3,38, «Камерцыйная дзейнасць» — 3,33, «Псіхалогія» — 3,25, «Фінансы і крэдыт» — 3,13. Не было конкурсу на спецыяльнасці «Педагогіка і методыка пачатковага навучання» з дадатковай спецыяльнасцю «Нямецкая мова» — 0,80, «Праграма «Беларусы ў свеце» — 0,85.

## СТУДЭНТАЎ СТАЛА БОЛЬШ!

На бясплатную форму навучання на дзённае аддзяленне сёлета было пададзена 2155 заяў пры плане набору 930. Па выніках уступных экзаменаў залічаны 931 чалавек. На дагаворнай аснове залічаны 470 абітурыентаў.

На завочную і вячэрнюю формы навучання на бясплатнай аснове залічаны 255 чалавек пры плане 265. А ўсяго было пададзена 765 заяў. На дагаворнай жа аснове завочна і на вячэрняй форме навучання будуць вучыцца 563 чалавекі.

А вось і інфармацыя аб паступленні медалістаў. Усяго было пададзена 484 заявы медалістаў. Пацвердзілі «5» 80 чалавек. 58 атрымалі «2». 93 не прайшлі па конкурсе. Залічаны на бясплатнае навучанне такім чынам 333 медалісты.

## ХТО ЯНЫ?

З ліку рабочых залічаны 267 чалавек, або 28,7 працэнта ад агульнай колькасці першакурснікаў. 48 — а гэта — 5,2 працэнта — калгаснікі. 615 або 66,1 працэнта служачыя. З іх 612 жанчын і 318 мужчын. Жыхароў сельскай мясцовасці — 179. Гарадскіх — 751, у тым ліку 463 — жыхары г. Гродна. 706 — беларусы, 135 — палякі, 78 — рускія, 11 чалавек — іншых нацыянальнасцяў.

## А МОЖНА І ТАК...

З залікам вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання залічаны 139 абітурыентаў. Пададзены быў 241 сертыфікат. У тым ліку па прадметах «Руская мова» — 134, «Матэматыка» — 84, «Фізіка» — 23.

## ЦИТАТА НОМЕРА:

**«Ничто в жизни не достается без большого труда».**

*Гораций.*

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Рэктарат, прафком, савет ветэранаў віншуюць з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў юбілярам. Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць.**

- 1 кастрычніка — **Яўгенію Ільінічну КАНДРАТОВІЧ** — метадыста вышэйшай катэгорыі.
- 1 кастрычніка — **Міхаіла Уладзіміравіча НОВІКАВА** — выкладчыка кафедры эканамічнай тэорыі.
- 5 кастрычніка — **Ігара Аллеравіча КРЫВАЛАПЧУКА** — загадчыка кафедры спартыўных дысцыплін.
- 7 кастрычніка — **Ларысу Іванаўну ЦЫГАНКОВУ** — дацэнта кафедры паліталогіі і сацыялогіі.
- 3 кастрычніка — **Нэлі Віктараўну ГАЙДАШАВУ** — загадчыцу лабараторыі гуманітарнага факультэта.
- 8 кастрычніка — **Святлану Яўхімаўну ЛАКОБУ** — старшага выкладчыка кафедры біяхіміі і біятэхналогіі.
- 12 кастрычніка — **Станіславу Францаўну ЗАПОЛЬСКУЮ** — прыбіральшчыцу навучальнага корпуса №6.
- 16 кастрычніка — **Аляксандра Міхайлавіча КАДАНА** — загадчыка кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі.
- 17 кастрычніка — **Тамару Аляксандраўну ВАРАНЦОВУ** — метадыста 1 катэгорыі аддзела тэхнічных сродкаў.
- 19 кастрычніка — **Аляксандра Мікалаевіча ЛІТВІНКУ** — выкладчыка кафедры замежных моваў.
- 23 кастрычніка — **Уладзіслава Юзэфавіча КУРСТАКА** — дацэнта кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі.
- 25 кастрычніка — **Надзею Ільінічну БЕРТЭЛЬ** — гардэробшчыцу навучальнага корпуса №2.
- 28 кастрычніка — **Вольгу Міхайлаўну КІРЫЛАВУ** — дацэнта кафедры анатоміі і фізіялогіі.
- 31 кастрычніка — **Веру Антонаўну ГЛІНСКУЮ** — бібліёграфа II катэгорыі бібліятэкі.

# ДЗЕНЬ ВЕДАЎ









Упершыню ў нашым горадзе 1 верасня студэнты трох гродзенскіх універсітэтаў разам святкавалі Дзень ведаў. А пятнаццатай гадзіне на плошчы Леніна выстраіліся калоны студэнтаў ГрДУ, медыцынскага і аграрнага універсітэтаў. З прывітаннем да студэнтаў звярнуўся старшыня гарвыканкома А.М.Пашкевіч. Ён павіншаваў усіх з гэтым святам — а пачатак новага навучальнага года для студэнтаў — урачыстае непаўторнае свята, з якога пачынаецца шлях у нязведанае. Яшчэ Анатоль Міхайлавіч павіншаваў асобна першакурснікаў — а сёлета іх — 3300 чалавек, — пажадаў таксама ўзаемапаразумення паміж студэнтамі і выкладчыкамі.

Затым студэнты ўсклалі вянкі да абеліску ў гарадскім парку. Лепшым з лепшых студэнтам — стыпендыятам даверана падняцце дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Гэта — студэнт 4 курса фізіка-тэхнічнага факультэта ГрДУ Дзмітрый Максіменка — стыпендыя імя Францыска Скарыны, студэнтка 4 курса зааінжынернага факультэта аграрнага універсітэта Алена Барысава — Прэзідэнцкі стыпендыят і студэнт 6 курса лячэбнага факультэта медыцынскага універсітэта Дзмітрый Карнялюк — Прэзідэнцкі стыпендыят. Пад гукі дзяржаўнага Гімна Рэспублікі Беларусь падымаецца дзяржаўны сцяг.

Далейшае вядзенне праграмы свята даручаецца студэнткам вучылішча мастацтваў сёстрам-двайнятам Валі і Сашы Груздзевым. Яны прадстаўляюць наступнага ўдзельніка праграмы — са словам прывітання і віншавання выступіла намеснік старшыні аблвыканкома Марыя Міхайлаўна Бірукова.

Ну, а якое ж студэнцкае свята абыходзіцца без віншавання рэктара, тым больш, што на плошчы — студэнты трох універсітэтаў. Слова прадастаўляецца рэктару самага маладога ў горадзе універсітэта — аграрнага — доктару сельскагаспадарчых навук, прафесару Вітольду Казіміравічу Песцісу.

— Усё ў вас яшчэ будзе!, — звярнуўся ён да студэнтаў. — Вы можаце праявіць сябе ва ўсім — у вучобе, навуцы, захапленнях. Жадаю новых сапраўдных сяброў, жадаю поспехаў на першай экзаменацыйнай сесіі і на дзяржэкзаменах.

Затым павінен быў выступаць рэктар старэйшага ў нашым горадзе універсітэта імя Янкі Купалы, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Сяргей Аляксандравіч Маскевіч. Але ў тыя мінуты ён выступаў з навуковым дакладам на канферэнцыі ў Лісабоне. Слова прадастаўляецца першаму прарэктару ГрДУ, доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару Яўгену Аляксеевічу Роўбе.

— Спадары студэнты! — Звярнуўся Я.А.Роўба да прысутных. — Толькі так — спадары студэнты, бо і сто гадоў таму і раней нікому не магло прыйсці ў галаву назваць чалавека ва універсітэцкай мантыі інакш як «спадар студэнт». Што ж рабіла студэнтаў спадарамі? Чаму так паважалі іх? У канцы шаснаццатага стагоддзя ёмка і поўна на гэтае пытанне адказаў філасаф Фрэнсіс Бэкон. «Scientia et potentia humana in idem coincidunt», што ў перакладзе з латыні гучыць як «Веды і чалавечая магутнасць — тоесныя».



«Навуковыя веды — адна з формаў улады» — так запісана ў выніковым дакуменце канферэнцыі нобелеўскіх лаўрэатаў. Так, веды — спецыфічная форма ўлады. І ведамі кожны павінен авалодаць сам. У адносінах да ведаў мы ўсе роўныя: і пабелены сівізной прафесар і юны першакурснік. У Гродне сёння тры дзяржаўныя універсітэты. Сярод іх — адзін з старэйшых у краіне Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы. Сёння ён з'яўляецца буйнейшай несталічнай ВНУ Беларусі і ўсё больш заваёўвае пазіцыі рэгіянальнага цэнтра адукацыі, навукі і культуры. Сёння свя-



та, Дзень ведаў. Прыміце віншаванні і пажаданні: студэнтам — новых творчых поспехаў у авалоданні бясцэнным капіталам — ведамі, а выкладчыкам — добрага здароўя і пошуку, пошуку новых адукацыйных тэхналогій, новых навуковых вынікаў. 1 верасня — афіцыйны старт навучальнага працэсу, новага навучальнага года. Мне ад імя рэктарата універсітэта хацелася б знайсці формулу для гэтага старту.

Што ж, як казалі старажытныя: «Hic i tur ad astra». Што значыць: «Адсюль і да зорак!»

Слова прадастаўляецца рэктару медыцынскага універсітэта прафесару П.В.Гарэліку. Ён таксама жадае студэнтам лёгкіх сесій, поспехаў у вучобе і навуцы.

Затым гучыць клятва першакурснікаў. Вядучыя зачытваюць яе тэкст перад мікрафонам, а потым студэнты дружна хорам паўтараюць слова: клянёмся! Пасля клятвы першакурснікам уручаюц-





ца сімвалы ведаў: нашы першакурснікі атрымліваюць кнігу, аграрнікі — ключ, медыкі — белы халат. Гучыць студэнцкі гімн «Гаудэамус», у паветры лунаюць рознакаляровыя шары.

Слова для прывітання першакурснікаў прадастаўляецца першаму прарэктару ГрДУ па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях, доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару Івану Платонавічу Мартынаву.

— Веды, навука, матэматыка — гэта сінонімы, — сказаў І.П.Мартынаў. — Ваша студэнцкае жыццё будзе цікавым. Вы будзеце шукаць адказы на пытанні, адкрываць нязнанае.

З заміраннем сэрца слухалі першакурснікі гэтыя словы. Асабліва яркім акордам выступлення прафесара І.П.Мартынава стала тое, што ён прачытаў перад мікрафонам свой верш, прысвечаны навуцы, матэматыцы, ведам. Гэта прагучала як наказ.

Потым ад імя студэнцтва горада першакурснікаў павіншаваў студэнт 6 курса медыцынскага універсітэта Дзмітрый Карнялюк.

Лепшым студэнтам трох універсітэтаў аддзел па рабоце з моладзю Гродзенскага гарвыканкома падрыхтаваў каштоўныя падарункі, якія будуць перададзены ў ВНУ. А на плошчы тады былі зачытаны прозвішчы.

Гімнам Рэспублікі Беларусь заканчваецца ўрачыстая цырымонія. Доўга яшчэ на плошчы імя Леніна гучалі музыка і песні. Забаўляльная праграма ўключала ў сябе канцэрт мастацкай самадзейнасці, у якім былі выступленні студэнтаў трох універсітэтаў. Ярка і запамінальна выступілі нашы: вакальна-інструментальны ансамбль «Каприз» і КВЗ «Янкі».

**Людміла ДАНІЛАВА,**
**Ігар ЯРАШЭВІЧ,**
**Людміла ВОЙДА (фота).**



**Інга Марцуль марыць стаць эканамістам-міжнароднікам. Перспектывы, вядома, вялікія. А пакуль што — лекцыі, канспекты, экзамены, залікі. Сесіі Інга здае на «выдатна». Мае намер да канца вучобы быць выдатніцай. Для гэтага і стараецца, часу марна не траціць.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнтка 4 курса факультэта эканомікі і кіравання Інга МАРЦУЛЬ.**

**Фота Ул.САРОКІНА.**

# НАШЫ АЛІМПІЙЦЫ

19 спартсменаў з г. Гродна ў гэтыя дні выступаюць на алімпійскіх спаборніцтвах у Сіднеі. З іх 6 чалавек — выпускнікі і студэнты нашага універсітэта. Усяго з Рэспублікі Беларусь у Алімпіядзе ўдзельнічае 138 спартсменаў.

У зборнай камандзе Рэспублікі Беларусь па грэка-рымскай барацьбе (трэнер — Ул. Максімовіч) — наш выпускнік майстар спорту міжнароднага класу Валерый Цыленць; у спаборніцтвах па грэблі на байдарках і каноэ будуць удзельнічаць студэнткі-завочніцы майстры спорту міжнароднага класу Святлана Вакула і Алена Бецць. Выпускніца ГрДУ Святлана Судак будзе выступаць у лёгкаатлетычных відах спорту (кіданне молата). Яна таксама майстар міжнароднага класу. Па пулявой стральбе выступяць нашы выпускнікі заслужаны майстар спорту алімпійскі чэмпіён Канстанцін Лукашык і заслужаны майстар спорту алімпійская чэмпіёнка Ірына Шылава. Яна, дарэчы, удзельнічала ў алімпіядах 4 разы.

**А. ЕМЕЛЬЯНЕНКА,**
**старшыня спартклуба.**

# Виктор ДЕМЧЕНКО: ЗАНИМАТЬСЯ СВОИМ ДЕЛОМ

**В рамках концепции непрерывного образования при нашем университете создано научно-методическое объединение, в которое входят электротехнический колледж имени Счастного, высший колледж легкой промышленности, химико-технологический техникум из г.Гродно и Новогрудский финансово-экономический техникум. Объединение работает довольно успешно. Лучшие выпускники колледжей становятся студентами университета и продолжают учебу, совместные учебные планы помогают отбирать талантливую молодежь в раннем возрасте и работать с ней целенаправленно.**

**Активно работает в научно-методическом объединении директор электротехнического колледжа имени Счастного Виктор Иванович Демченко. Сегодня он — гость газеты «Гродзенскі універсітэт».**



**— Виктор Иванович, Вы — выпускник нашего тогда еще пединститута. Вот с этого и начнем. Что он для Вас значит, чем запомнились годы учебы?**

— О, это была самая лучшая пора жизни. Я учился на филологическом факультете. Из моих любимых преподавателей теперь один А.М.Петкевич остался. Вспоминаю В.П.Козлова, Д.С.Марковского, С.А.Григорьева, Е.И.Лавринайтис, Б.М.Фиха. Из сокурсников больше всего запомнились Люда Ерунцева — она и сейчас работает в университете, Валя Буслаева, Маша Тарантей (ныне покойная). Я играл в народном театре, и этих студенток помню еще по театру. А еще — ребят — Сашу Подгайченко, Колю Якубовича, Володю Егорычева (сейчас — преподаватель университета). С ними, вернее, с группой народного театра мы объездили страну со своими спектаклями. Нас очень хорошо встречали, мы получали дипломы, подарки. Хотя прошло 30 лет с тех пор, так ярко все помнится, будто было вчера. Я был заведующим студенческим клубом пединститута. Это давало возможность заходить к ректору, что для студента, согласитесь, немаловажно: повышается не только твой статус, но и ответственность. В 1967 году женился, родилась дочь, пришлось перевестись на заочное отделение и идти на работу. Трудился в детприемнике в милиции, в мединституте секретарем комитета комсомола, затем — на партийной работе. Так что опыт работы с людьми — еще с молодых лет.

**— Как Вы стали директором?**

— Я — учитель. Была голубая мечта — стать директором, чтобы что-то можно было решать, влиять на события, организовывать. Был сначала заместителем директора в училище текстильщиков. В электротехническое училище №7 пришел 20 лет назад. Сейчас это — колледж, многоуровневое многофункциональное учебное заведение, которое напрямую выдает своих выпускников ГрГУ и Белорусской политехнической академии при условии, конечно, что ребята заканчивают колледж на «4» и «5».

**— Что для вашего коллектива значит научно-методическое объединение?**

— Многое значит. Преподаватели университета работают у нас, читают лекции. Есть совместные программы. Образование многоуровневое. Первый уровень — рабочие специальности, второй — среднее специальное образование — техник-электрик, техник-механик. Выпускники третьего уровня становятся студентами ВУЗов. Последние 5 лет в среднем по 75 человек в год поступают в ГрГУ и БПА. Нынче был очень большой конкурс в наш колледж. Зачисляли в первую очередь тех, у кого был высокий балл аттестата. Сейчас у нас учится 1040 человек.

**— Как насчет ноу-хау в системе образования?**

— Есть у меня идея, и мы уже приступаем к ее осуществлению. Технический талант — а такой есть — нужно готовить с детства. Мы работаем в этом направлении со средними школами №27 и 32. Если мы будем готовить ребят к жизни и профессии еще в школе — будет выбор именно тех, кто нужен, кто придет в технический колледж осознанно. Было ведь поветрие: все — на юрфак. И что из этого вышло?

Хочу на практике доказать действенность учебных заведений нового типа — колледжей, лицеев. Есть наметки в сотрудничестве и с другими школами.

**— Что Вас больше всего сейчас беспокоит?**

— Бедность наша. Бедный учитель. Из-за низкой зарплаты некоторые уходят на предприятия, фирмы, на рынок. Учитель должен учить. Те, кто остается — это мужественные люди. И мы с ними — в одной команде. Надеемся, что-то изменится к лучшему.

**— Что Вы хотели бы изменить в жизни общества, если бы представилась такая возможность?**

— Я бы очень хотел, чтобы каждый занимался своим делом. Только тогда будет толк.

**— У Вас есть идеал?**

— Стараюсь не идеализировать, но стремиться к совершенству, считаю, должен каждый.

**— Что для Вас важнее всего в личной жизни?**

— Чтобы была счастлива моя семья — жена, дочь, сын, их семьи. Чтобы росли здоровыми внуки.

**— Вы такой жизнерадостный, оптимистичный человек. Это что — имидж или характер?**

— Меня таким родители воспитали. Что толку жаловаться на жизнь. Надо трудится, думать и делать, тогда и проблем будет меньше.

**— У Вас есть увлечение?**

— Очень люблю читать. Собрал большую библиотеку. В основном — классика. С удовольствием читаю Пикуля, Шолохова, Толстого, Чехова. А вообще нахожу прелесть в любой книге.

**— Вы работаете с молодежью. Видите, наверное, ее проблемы как никто...**

— Пока не поднимем экономику с колен, эти проблемы будут. Молодежи нужно больше внимания, заботы и доверия. Самостоятельности. Нужно не учить жизни, а готовить к ней.

**— Что Вы думаете о правах человека в Беларуси?**

— Мои права не нарушаются. Да и вообще, на мой взгляд, проблемы не существует. Не надо лезть в сферу, которая тебя не касается. Я уже сказал, что каждый должен заниматься своим делом. Никто никого не ущемляет.

**— Что бы Вы в первую очередь предприняли, если бы имели возможность влиять на политику?**

— Я — профессионал в отрасли образования. И буду работать в этом плане. Нужно создавать условия, чтобы каждый мог раскрыть свои способности с самого раннего возраста. То есть, подготовка должна быть ступенчатой. Еще я обратил бы внимание на детей-инвалидов. Нужно создавать супер-условия, чтобы максимально облегчить участь их родителей. Многое нужно делать по борьбе с пьянством. Нужно формировать нетерпимость общественного мнения. Ну и, конечно, здоровье нации — это забота всех, и работы в этом направлении предстоит много.

**— Спасибо.**

**Интервью вела Людмила ДАНИЛОВА.**

**Фото Игоря ЯРОШЕВИЧА.**

*СОВЕТЫ ПСИХОЛОГА*

# ДЕЛОВАЯ БЕСЕДА

Деловая беседа — это разговор на профессиональные темы. Исследования показывают, что активность людей развитых культур удивительно стандартизирована. Из своего активного времени люди тратят примерно 9% на письмо, 10% — на чтение, 25% — на говорение и 40% — на слушание. Как видно, более 70% своего времени люди затрачивают на беседы.

При ведении деловой беседы предлагаем воспользоваться следующими советами:

— не сидите на краешке стула. Это создает впечатление, что Вы хотите поскорее отделаться от собеседника;

— не ерзайте на стуле. Ерзанье свидетельствует о неуверенности и нерешительности;

— не тяните время. Растяжка беседы воспринимается как нежелание обсуждать важные вопросы;

— не спешите. Лучше не проводить беседы, чем спешить и комкать обсуждаемые проблемы. Спешка всегда оценивается негативно;

— ставьте вопросы так, чтобы они не наводили на ответы и не обнажали преждевременно выводов;

— меньше употребляйте слово «я». Это создает неблагоприятное впечатление;

— не смотрите на собеседника свысока, считайте его равным с собою во всех отношениях;

— не горячитесь. Горячность часто лишает теплоты отношений;

— не создавайте из себя прорицателя и умника;

— не делайте выводов за собеседника;

— не делайте скоропалительных обещаний. Может случиться так, что обещания по объективным обстоятельствам выполнить не представится возможным;

— в беседе решайте только те вопросы, которые входят в Вашу компетенцию.

**Павел КОВАЛЕВСКИЙ.**

*ПИСЬМА*

## БЕЛАЯ ВОРОНА?

Я — белая ворона. Не курю, не пью пива, не говоря уже о более крепких напитках. Не «западаю» на шмотки: весь семестр могу проходить в одних джинсах, меняя две-три кофточки. Слежу только, чтобы они были чистыми и аккуратными. Не понимаю разговоров о парнях, о том, кто, как и где «оторвался». Вернее, не поддерживаю. Мне скучно со сверстниками. Решила написать в газету. Может, есть единомышленники. Дайте знать. Напишите в «Гродзенскі універсітэт». Что сказать о себе? Никакая я не отличница и не талант. Обыкновенная студентка. Правда, первый курс проскочила без троек, намерена и дальше их не «хватать». Волнует одно: так ли я живу, почему я не такая, как все? Я не сухарь. Читаю книги и статьи о любви, мечтаю о ней. Но представить себе интимного партнера моего возраста не могу. Думаю, что это будет человек «в годах» — опытный, умный, серьезный. Может, у меня проблемы, как считают в общежитии? Не могу терпеть курящих, пьющих, сквернословящих. А вокруг, к сожалению, в основном — такие. Отзовитесь, если есть другие!

**Наташа, студентка второго курса.**

**ОТ РЕДАКЦИИ:** Это письмо в редакцию мы опубликовали полностью, без сокращений. Чувствуется, что его автор — человек не поверхностный, думает о завтрашнем дне. Наташа, возможно, не одна такая, и хочет поговорить на страницах газеты о проблемах своих ровесников. Надеемся, дорогие студенты, вы поддержите такой разговор. Не называйте фамилию, если стесняетесь. Понимаем. Выслушаем. Поможем. Пишите!

# ШЧЫРЫ ДЗЯКУЙ

Савет ветэранаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы выказвае глыбокую ўдзячнасць адміністрацыі, рэктарату і прафкому універсітэта за пастаянны клопат аб ветэранах. Сёлета рэктарат выдзеліў на закупку бульбы гароднiны кожнаму непрацуючаму ветэрану па 10000 рублёў. Аказваецца таксама матэрыяльная дапамога ветэранам-юбілярам. Шчыры дзякуй!

**Ад імя ветэранаў ГрДУ — старшыня савета ветэранаў М.ВАСІЛЮЧАК.**

*В ПРОФКОМЕ СТУДЕНТОВ*

# МЫ РАБОТАЕМ ДЛЯ ВАС

Традиционно студенты, поступившие в Гродненский государственный университет имени Янки Купалы, становятся членами профсоюза работников образования и науки.

Профсоюзный комитет студентов университета, избираемый на основании Устава Белорусского профессионального союза работников образования и науки, осуществляет представительство перед администрацией высшего учебного заведения от имени студентов по всем вопросам обучения, труда, быта, образования, отдыха и пользуется правами юридического лица. Целью деятельности профкома студентов является защита социально-экономических, правовых и иных интересов студентов, главным образом в рамках Соглашения, заключенного с администрацией университета по всем аспектам жизни и деятельности студентов в университете.

Чем же именно занимается профком?

Студенческий профком осуществляет общественный контроль за выполнением нормативных документов, касающихся обучения студентов, их социально-экономических и иных прав; вносит руководству высшего учебного заведения предложения по улучшению учебного процесса, производственной практики, рациональному использованию времени студентов, по составлению расписания экзаменов, зачетов, консультаций; контролирует правильность и своевременность назначения и выплаты стипендий, командировочных расходов и различных пособий; принимает участие в осуществлении мероприятий по улучшению условий труда, быта и отдыха студентов, проводит воспитательную работу; участвует в организации и проверке выполнения планов строительства, ремонта и оборудования студенческих общежитий, культурно-бытовых учреждений и спортивных сооружений, в контроле за правильным расходованием средств, ассигнованных на эти цели; участвует через своих представителей в работе студенческих советов общежитий; представители студенческого профкома пользуются в советах и в комиссиях правом решающего голоса и выступают в них от имени профсоюзной организации; участвует в разработке и принятии Устава вуза; участвует в контроле за работой предприятий общественного питания, обслуживающих студентов; оказывает помощь малообеспеченным студентам, студентам-сиротам, инвалидам, студенческим семьям; направляет студентов на санаторно-курортное лечение, в дома отдыха, профилактории и в оздоровительно-спортивные лагеря; участвует в осуществлении практических мероприятий по совершенствованию лечебно-оздоровительной работы; вносит предложения администрации университета, в вышестоящие профсоюзные органы, в местные органы власти и управления, направленные на решение учебных, социально-экономических и других проблем студентов; проводит работу по организации досуга и быта студентов; взаимодействует в своей работе с различными общественными организациями учащейся молодежи, а также проводит активное сотрудничество со многими студенческими организациями в Беларуси, Москве, на Украине.

Совместно администрация и профком студентов проводят распределение мест в общежитии между факультетами, отделениями и курсами; принимают решение о выделении жилой площади в общежитии и продолжительности сроков проживания; осуществляют выплату пособий по беременности и родам.

Все приказы по переводам, поощрениям, наказаниям, отчислениям студентов и т.д. согласовываются с профкомом.

Приведем несколько примеров из студенческой жизни за 1999-2000 учебный год. Профкомом только из своих средств выплачена студентам материальная помощь в размере 1227568 рублей. Израсходовано на проведение спортивных мероприятий около 344986 рублей. С участием профкома студентов проведено большое количество культурно-массовых мероприятий (конкурс первокурсников, конкурс КВН, мероприятия, посвященные 60-летию университета, конкурс «Мисс университета», экскурсии по историческим местам Беларуси и России (Жировичи, Мир-Новогрудок, Полоцк, Санкт-Петербург, Пушкинские места), на которые израсходовано порядка 1684655 рублей.

По инициативе профкома разработаны и приняты «Положение об оказании материальной помощи студентам бюджетной формы обучения ГрГУ» и «Положение о материальном стимулировании студентов бюджетной формы обучения ГрГУ».

По льготной цене распространялись абонементы в ФОК и облдрамтеатр, а также билеты на многие городские мероприятия. Подготовлен новогодний утренник для детей студентов, закуплены подарки для них.

При непосредственном участии студенческого профкома создана сборная команда КВН «Янки». При поддержке профкома проводилась V республиканская научная конференция студентов и аспирантов.

Только в профкоме можно приобрести международный студенческий билет ISIC, дающий скидку на многие виды услуг более чем в 95 странах мира. В профкоме иногородние студенты могут получить информацию о сдаче комнат и квартир.

Наиболее активные студенты, проявившие себя в общественной жизни университета, всегда поощрялись и поддерживались, в том числе материально. Так, за последний учебный год 4 человека дополнительно к основной стипендии получали еще и профсоюзную.

11 человек были награждены профсоюзными грамотами. Свыше 36000 рублей было выделено на премирование таких студентов.

Это — основные направления деятельности профкома студентов. У студентов бюджетной формы обучения безналичным путем через бухгалтерию университета ежемесячно удерживаются профсоюзные взносы в сумме 1% от стипендии. Студенты, занимающиеся на договорной основе, ежемесячно платят взносы в сумме одного процента от минимальной заработной платы.

Уважаемые студенты! Только Ваша активная созидательная деятельность при помощи профкома и поддержке администрации позволит Вам реализоваться за время студенческой жизни и сделать лучше жизнь в нашем университете.

Если Вы небезразличны к этой жизни и Вам хочется осуществить какие-либо замыслы, а также если у Вас просто возникли трудности или Вы с чем-то не согласны, — по всем вопросам и с любыми предложениями обращайтесь в профком студентов с 9.00 до 18.00 по рабочим дням: кабинет № 229 главного корпуса, телефон 44-50-54.

Информацию о деятельности профкома можно получить, заглянув на Internet-страничку www.grsu.grodno.by/prkom.

**Председатель:**
**Александр Александрович ГРИНЬ.**

**Зам. председателя:**
**Игорь Леонидович КЕРГЕТ.**

ЗАМЕТКІ З ВЫСТАВЫ

# ВІЦЕВА ЗОРКА

Сюды, у выставачную залу па вуліцы Ажэшкі, у гэтыя дні ідуць і ідуць людзі. Паток наведвальнікаў асабліва павялічваецца а другой палове дня, калі заканчваюцца заняткі ва універсітэце. Ды і школьнікаў ды навучэнцаў каледжаў даволі шмат. Служачыя кажуць, што ніколі за гады існавання выставачнай залы сюды не прыходзіла адначасова столькі моладзі. Ніколі.





Здаецца што і выставы такой не было ніколі. Выстава «Віцева зорка» адкрылася 7 верасня і будзе дзейнічаць два тыдні. Усяго два тыдні. У гэтых экспазіцыях як на далоні ўсё кароткае яркае жыццё студэнта аддзялення мастацтваў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы Віктара За-



лецкага. Ён трагічна загінуў у чэрвені, збіты на пешаходным пераходзе п'яным вадзіцелем BMW. Віктар тады вяртаўся з Нёмана, дзе фатаграфаваў родныя краявіды. Ён паспеў адштурхнуць убок сваю дзяўчыну, тым самым выратаваўшы ёй жыццё.

Ён марыў аб выставе і рыхтаваўся да яе. Са студэнцкай стыпендыі друкаваў у студыі «Кодак» па два-тры здымкі ў месяц. У фотаклубе «Гродна», куды Віктар прыносіў свае фотаработы, якія здзіўлялі нечаканымі ракурсамі і прыгажосцю, адразу заўважылі, што нараджаецца Талент. І гэтую выставу разам з універсітэтам і бацькамі Віктара арганізаваў фотаклуб. Як рэквіем гучаць словы старшыні фотаклуба «Гродна» Аляксандра Ласмінскага, напісаныя ў якасці прадмовы да выставы. Тут жа — партрэт Віктара. Тонкія рысы твару, задумёны позірк, натхненне... Такім ён застанецца ў памяці тых, што яго ведаў. І хто не ведаў. Бо не можа пакінуць раўнадушным нікога гэты позірк Майстра, Аўтара. Ён бачыў тое, на што звычайны чалавек, бадай, не звярнуў бы аніякай увагі. Ад яго фотаработ вее самотнасцю і тугой. А яшчэ — незвычайным святлом. Прыгажосць на карцінах — ракавая, трагічная. Вось, напрыклад, цагляная старадаўняя сцяна. На ёй — трэшчына і адтуліна. А там, на тым баку — небыццё. Ва ўсялякім разе, аўтары гэтых радкоў пабачылі менавіта так. А вось просты сялянскі дом. За ім — яшчэ адзін і яшчэ... Але яны знікаюць у ранішнім тумане. А гэты, на першым плане, не такі ўжо элегантны, хутчэй, грубы, каржакаваты, стаіць, узвышаецца над наваколлем. І будзе стаяць. Як будзе заўсёды трымацца свет на простым чалавеку — хлебаробе, сейбіце.







(Заканчэнне на 8-й стар.)







Прыгажосцю і непаўторнасцю здзіўляюць імгненні з жыцця прыроды, якія падлавіў фотамайстра. Той жа павучок ці сцяблінка травы зачароўваюць, не адпускаюць ад сябе. Знаёмыя куточкі горада, Каложа — усё гэта ён любіў, ведаў і разумеў. Магчыма, таму прырода і адкрывала яму свае таямніцы.

Кожная работа суправаджаецца вершаванымі радкамі А. Фета, К. Бальмонта. І ўсё так адпавядае агульнаму настрою, так кладзецца ў радок...

«Мы не грустим, пугаясь снова
Дыханья близкого зимы.



А голос лета прожитого
Яснее понимаем мы».

**А.ФЕТ.**

Віктар Залецкі — мастак са сваім стылем і бачаннем. І гэта можна сказаць не толькі па фотаработах, выстаўленых сёння. Ва універсітэце была прадстаўлена выстава яго карцін. І гэта было мастацтва высокай пробы.

— Нібы дадатковае святло запалілася ў памяшканні, — піша ў прадмове да выставы Аляксандр Ласмінскі. — Усе ў фотаклубе былі ўражаны, калі Віктар упершыню прынёс на суд прафесіяналаў свае работы.

Усе былі зачараваны хараством першых яго пробаў. Мы ўсе тады зразумелі: гэта зараджаецца зорка маладога таленту і прынялі Віктара Залецкага ў клуб, а некалькі работ уключылі ў выставу, якая прысвячалася 25-годдзю фотаклуба «Гродна». Тады яму споўнілася ўсяго 18 гадоў. Здымкі ён рабіў старэнькім «Зенітам».

Але тыя здымкі былі зорныя. Ён бачыў таямніцы прыроды, браў незвычайныя ракурсы, рабіў эксперыменты са святлом, колерам, рабіў нацюрморты. Памалу ён уцягваўся ў грамадскае жыццё, удзельнічаў у выставах. Першая замежная выстава В.Залецкага была летась у Англіі. А ў Гродне — у галерэі «Тызенгауз», у родным універсітэце. Яго выкладчыкі А.Багустаў і А.Ляшчынскі радаваліся кожнай удачы студэнта.

«Так хочацца жыць і рабіць усё, каб захаваць прыгажосць і багацце наваколля. На такія думкі наводзяць экспазіцыі выставы».

*Студэнты медыцынскага універсітэта.*

З першых жа дзён выставы кніга водгукаў запаўняецца кожны дзень — старонка за старонкай. А гэта сведчыць аб тым, што Віктар пражыў сваё кароткае жыццё паўнакроўна. Магчыма, гора сям'і Залецкіх ад гэтага людскога прызнання пачне пакрысе адыходзіць. Хацелася б верыць у гэта.

12 жніўня Віктару споўнілася б 22 гады. Бацькі страцілі сына, універсітэт — студэнта, а ўсе мы з вамі: горад, краіна — страцілі Талент, які запаліўся яркай зоркай на родным небасхіле. Цяпер ён належыць Богу. І Гісторыі...

**Людміла ДАНІЛАВА,**
**Людміла ВОЙДА (фота).**


*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне №519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.
ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:*
**М. ВЕРСТАК,**
**В. ЗАКРЭЎСКІ.**
*Карэктура:*
**Н. ДУДКО.**

*Здадзена ў набор 08.09.2000.*
*Падпісана да друку: 14.09.2000. 15.00*
*Заказ №269*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 700 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не утрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* ✉ *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228.* ☎ *72-08-17.*